Лен. газета, 1982 г., № 79

Ідуць летнія канікулы ў школьнікаў, але залы Жодзінскай гарадской дзіцячай бібліятэкі не пустуюць. І сапраўды, хіба не цікава адправіцца разам з героямі кніг у захапляючае падарожжа, хадзіць у разведку ў тыл ворага і г. д.

А выбар у бібліятэцы багаты — 45 тысяч экземпляраў кніг. Толькі за чатыры месяцы з дня адкрыцця гэтай культурна-асветнай установы яе работнікі абслужылі больш як 4000 юных чытачоў.

Наведаць бібліятэку наогул цікава. Тут шмат тэматычных выставак. Сярод іх — «Пяю пра маю Айчыну», прысвечаную 60-годдзю ўтварэння СССР, а таксама шырокая экспазіцыя да 100-годдзя з дня нараджэння вялікіх песняроў беларускага народа Якуба Коласа і Янкі Купалы, юбілей якіх будзе адзначацца сёлета сусветнай грамадскасцю.

НА ЗДЫМКУ: бібліятэкар Алена Львоўна Клябанава дапамагае юным чытачам падабраць цікавую літаратуру.

Фота В. АЛЯШКЕВІЧА.